# § 36. Рэфармацыя. Рэлігійныя войны ў Заходняй Еўропе. Контррэфармацыя

ХРЫСЦІЯНСТВА РЭФАРМАЦЫЯ
ЛЮТЭРАНСТВА ЖАН КАЛЬВІН
ІНДУЛЬГЕНЦЫЯ
МАРЦІН ЛЮТЭР ПРАТЭСТАНТЫЗМ
КОНТРРЭФАРМАЦЫЯ
КАЛЬВІНІЗМ

Рэфармацыйны рух

Чаму каталіцкая царква бараніла феадальныя парадкі?

**Рэфармацыя** — масавы рэлігійны, сацыяльна-палітычны рух XVI ст., накіраваны на пераўтварэнне рымска-каталіцкай царквы, які прывёў да ўзнікнення пратэстантызму.

## 1. Перадумовы і прычыны Рэфармацыі.

**Рэфармацыя**, што разгарнулася ў XVI ст., з'явілася адной з ключавых падзей еўрапейскай гісторыі. Шмат у чым яна вызначыла шляхі развіцця кантынента на некалькі наступных стагоддзяў. Рэфармацыйны рух не быў аднародным і меў свае асаблівасці ў розных краінах. У шырокім сэнсе Рэфармацыя была першым значным пратэстам маладой буржуазіі супраць феадалізму і яго ідэалагічнай апоры — царкоўных вучэнняў, якія ўжо не адпавядалі прадпрымальнаму духу Новага часу.

Напачатку Новага часу каталіцкая царква яшчэ мела значны ўплыў на ўсе сферы жыцця еўрапейскага грамадства. Аднак яе ўсеўладдзе выклікала ўсё большую незадаволенасць розных пластоў насельніцтва. Карупцыя ў царкоўнай іерархіі, продаж індульгенцый, бюракратызацыя рэлігійнага жыцця не маглі не зрабіцца аб'ектам крытыкі з боку адукаванай часткі еўрапейцаў і нават часткі духавенства. Усё ярчэй была заўважная патрэба ў больш глыбокім асабістым духоўным вопыце, які не патрабаваў пасярэднікаў.

Істотнай прычынай пашырэння рэфармацыйных вучэнняў было імкненне кіраўнікоў германскіх дзяржаў да незалежнасці ад Габсбургаў. За больш чым

сто гадоў да Вестфальскага міру, якi рэалізавау іх памкненні, яны здзейснілі першы крок у гэтым кірунку, падтрымаўшы ідэолагаў Рэфармацыі. Палітычныя падставы мелі і рэфармацыйныя пераўтварэнні ў астраўной Англіі, якая не жадала знаходзіцца ні ў якой залежнасці, у тым ліку царкоўнай, ад кантынентальнай Еўропы.

**Перадумовы рэфармацыйнага руху**

Важную ролю ва ўсіх еўрапейскіх працэсах у ранні Новы час адыгрываў тэхналагічны прагрэс. Вынайдзены І. Гутэнбергам друкарскі станок паспрыяў шырокаму распаўсюджанню інфармацыі і ведаў. Біблія рабілася даступная для ўсё большай колькасці людзей, што спрыяла крытычнаму ўспрыняццю царкоўных дагматаў і навакольнага свету.

Не варта забывацца і на сацыяльна-эканамічныя перамены таго часу. Рост гарадоў, станаўленне буржуазіі, пашырэнне ідэй індывідуалізму падрыхтавалі глебу для глыбокіх пераўтварэнняў. Рэнесансныя каштоўнасці, што заклікалі паважаць чалавечы розум і інтэлект, несумненна, уплывалі на грамадскую свядомасць.

Такім чынам, Рэфармацыя была вынікам узаемадзеяння шэрагу фактараў — ад рэлігійных, палітычных і сацыяльна-эканамічных да культурных і тэхналагічных.

„Рэлігія павінна прымаць форму прамога і адкрытага дыялогу паміж Богам і чалавекам. Набажэнствы павінны праводзіцца простанароднай мовай, што зробіць іх даступнымі і зразумелымі“.

Эразм Ратэрдамскі,
галандскі філосаф, мысляр, пісьменнік,
прызваны «князем гуманістаў»



Як вы лічыце, чаму ідэалы гуманізму зрабіліся ідэалагічнай перадумовай рэфармацыйнага руху?

Пачатак Рэфармацыі ў Германіі

**2. Асаблівасці рэфармацыйнага руху ў розных краінах.** Каля вытокаў Рэфармацыі стаяў *Марцін Лютэр* — манах, які падзяляў агульную незадаволенасць царкоўнымі злоўжываннямі. Яго 95 тэзісаў, апублікаваныя ў 1517 г., выклікалі хвалю спрэчак і зрабіліся асновай пратэстанцкага веравучэння. Лютэр прапаведаваў ідэю аб тым, што вера, а не справы або купля індульгенцый, забяспечвае ўратаванне, і гэта было сур'ёзным выклікам традыцыйнай царкоўнай думцы.

### ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Фрагменты з 95 тэзісаў Марціна Лютэра**

36. Усякі хрысціянін, які шчыра раскаяўся, атрымлівае поўнае вызваленне ад пакарання і віны, дараванае яму нават без індульгенцый.

43. Належыць вучыць хрысціян: той, хто падае жабраку або пазычае абяздоленаму, робіць лепш, чым той, хто купляе індульгенцыі.

62. Сапраўдны скарб Царквы — гэта прасвятое Евангелле (Дабравесце) аб славе і ласцы Бога.

79. Сцвярджаць, што пышна ўзняты крыж з папскім гербам раўнамоцны крыжу Хрыстоваму, значыць блюзнерыць.

1. *Супраць чаго выступаў Марцін Лютэр?*
2. *Дакажыце, што рэфармацыйны рух меў не антырэлігійны, а антыцаркоўны характар.*

Навіна пра выступленне М. Лютэра супраць продажу індульгенцый, паводле слоў сучасніка, «за чатыры тыдні абляцела ўвесь хрысціянскі свет». Растлумачце, чаму рух за царкоўную рэформу зрабіўся агульнаеўрапейскім.

Дзейнасць М. Лютэра прывяла да пачатку Рэфармацыі ў Германіі і адкрыла шлях для пашырэння пратэстантызму ў іншых краінах Заходняй Еўропы.

Царкоўная рэформа на ўзор, прапанаваны М. Лютэрам, праводзілася ў розных краінах па-рознаму: у Паўночнай Германіі князі ажыццяўлялі яе ў сваіх уладаннях, у Англіі, Даніі і Швецыі — кароль пры падтрымцы знаці, а ў Швейцарыі і Нідэрландах ініцыятыву брала на сябе багатая і ўплывовая буржуазія. Каталіцкая царква паступова траціла сваю былую магутнасць. Паўсюль высмейваліся яе служкі, публікаваліся карыкатуры.

«Жэнеўскі» папа

Рэфармацыю ў Швейцарыі ўзначаліў Ульрых Цвінглі. Ён падтрымліваў шмат якія тэзісы М. Лю-

тэра, але пайшоў далей: адпрэчыў усякую царкоўную іерархію і інстытуты, не заснаваныя непасрэдна на Бібліі. Другой важнай постаццю Рэфармацыі ў гэтай краіне быў *Жан Кальвін*. «Жэнеўскі папа», як яго называлі, сфармуляваў вучэнне аб прадвызначэнні і боскім суверэнітэце, якое ўнесла сваю спецыфіку ў швейцарскі і французскі пратэстантызм.

У Жэневе Ж. Кальвін стварыў новую мадэль царкоўнай абшчыны, якая нагадвала манастыр са строгімі аскетычнымі правіламі. Тут дазвалялася толькі адно задавальненне — сямейнае жыццё. Нагляд за грамадзянамі быў суровы: забаронены былі спевы, танцы, пераяданне, ужыванне алкаголю і нашэнне яркага адзення. За ненаведванне набажэнстваў спаганяўся штраф. Тых, хто сумняваўся ў хрысціянскіх ісцінах, як іх тлумачыў Жан Кальвін, каралі смерцю на вогнішчы.

**Асаблівасці рэфармацыйнага руху ў Англіі**

Свой шлях у рэфармацыйным руху абрала Англія. Рэфармацыя была ініцыявана каралём *Генрыхам VIII*, які адмовіўся прызнаць уладу Папы Рымскага і заснаваў англіканскую царкву. У Англіі Рэфармацыя працякала стрымана і захавала многія элементы традыцыйнага каталіцызму. Папства ў Англіі было адменена, кіраўніком новай царквы, што заняла сярэдняе становішча паміж каталіцызмам і пратэстантызмам, зрабіўся кароль. Спецыяльны парламенцкі акт на гэты конт быў прыняты ў 1534 г. Тады ж пачаўся працэс адбірання манастырскіх зямель, што часткова перайшлі да караля, часткова былі раздадзены або прададзены «новаму дваранству», якое падтрымала пачынанні караля. На адабраных царкоўных землях праводзіліся агароджванні.

Рэфармацыйны рух развіваўся на фоне сацыяльна-эканамічных змяненняў, пашырэння кнігадрукавання і росту адукаванасці насельніцтва. Рэфармацыя зрабілася каталізатарам гэтых працэсаў, але адначасова і іх вынікам.




*Рэфармацыя ў Еўропе XVI ст.*

Успомніце, прычынай якой вайны ў Еўропе былі супярэчнасці паміж каталікамі і пратэстантамі. Назавіце дзяржавы, якія зрабіліся цэнтрамі еўрапейскай Рэфармацыі.

**Пратэстантызм**

Рэфармацыя прывяла да ўзнікнення новага кірунку ў хрысціянстве — пратэстантызму, які аб'ядноўвае сёння шэраг самастойных цэркваў: лютэранства, кальвінізм, англіканскую царкву і інш. Гэтыя цэрквы крыху адрозніваюцца спосабамі правядзення набажэнства і арганізацыі, але звязаныя агульным паходжаннем і догмай.

**ПРАТЭСТАНЦКАЕ ВЕРАВУЧЭННЕ**

- Атрыманне даравання толькі верай
- Адмаўленне ад шанавання святых, ікон і мошчаў, пакланенне толькі Богу
- Адмаўленне ад царкоўнай іерархіі
- Спрошчанае набажэнства на мясцовых мовах
- Прыняцце выключнага аўтарытэту Свяшчэннага Пісання (Бібліі)

### 3. Рэлігійныя войны.

**Рэлігійныя войны** XVI–XVII стст. — адна з самых змрочных старонак гісторыі Заходняй Еўропы. Узнікненне пратэстанцкай Рэфармацыі і адпор каталіцкай царквы выклікалі серыю палітычных і рэлігійных канфліктаў і войнаў на кантыненце.

**Рэлігійныя войны** — шэраг узброеных сутыкненняў у Еўропе ў XVI–XVII стст. паміж пратэстантамі і каталікамі.

Каталіцкая частка Еўропы падзялілася на два варожыя лагеры. У паўночных дзяржавах, якія прынялі пратэстантызм, — Англіі, Шатландыі, Швецыі і большай частцы Германіі — адбываліся ганенні на каталікоў. У Італіі, Іспаніі і Партугаліі, дзе захавала свой уплыў каталіцкая царква, пратэстанты зазналі дыскрымінацыю. Рэформа Генрыха VIII прывяла да крывавых сутыкненняў у Англіі паміж пратэстантамі і каталікамі, якія пачаліся з моманту ўзыходу на трон каталічкі Марыі Цюдор. Яны працягваліся да другой паловы XVI ст. Хваля гвалту спынілася толькі пасля прыходу да ўлады каралевы Лізаветы I, пры якой канчаткова сфарміравалася дзяржаўная англіканская царква. У часы



*Партрэт Марыі I. 1554 г.*

Даведайцеся, чаму Марыя Цюдор атрымала мянушку «Крывавая».

Рэфармацыі ў Англіі пратэстанты падзяліліся на англікан і пурытан.

У Францыі працяглая вайна паміж каталікамі і гугенотамі (французскімі пратэстантамі) прывяла да гібелі дзясяткаў тысяч чалавек. Самай вядомай і трагічнай падзеяй гэтага супрацьстаяння стала Варфаламееўская ноч 1572 г., калі былі забітыя тысячы гугенотаў. Вайна за веру цягнулася да выдання ў 1598 г. Генрыхам IV Нанцкага эдыкта, які даў гугенотам рэлігійныя і грамадзянскія правы.

У Нідэрландах паўстанне супраць Іспаніі, першапачаткова матываванае палітычнымі і рэлігійнымі прычынамі, прывяло да ўтварэння на тэрыторыі Паўночных Нідэрландаў Рэспублікі Злучаных правінцый.

Гэтыя канфлікты і войны не зводзіліся толькі да барацьбы паміж рэлігіямі, яны адлюстроўвалі сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя супярэчнасці той эпохі.

**Контррэфармацыя** — рух у Еўропе сярэдзіны XVI — XVII ст., накіраваны супраць Рэфармацыі, які меў мэтай аднавіць пазіцыі і прэстыж каталіцкай царквы.

**4. Контррэфармацыя.** **Контррэфармацыя**, або каталіцкая Рэфармацыя, — гэта рэакцыя каталіцкай царквы на пратэстанцкую Рэфармацыю. Яе мэтай было не толькі супрацьстаяць пашырэнню пратэстантызму, але і ўнутрана абнавіць і рэфармаваць саму каталіцкую царкву.

Першапачаткова каталіцкая царква адказала на пратэстанцкі рух актыўнымі дзеяннямі інквізіцыі. У 1542 г. у Папскай вобласці была створана цэлая сістэма ўстаноў пад назвай Кангрэгацыя святой інквізіцыі. Аднак гэтага аказалася недастаткова. Абвінавачванні з боку пратэстантаў у карупцыі і маральным заняпадзе каталіцкага духавенства не толькі не спыняліся, а ўсё больш узмацняліся. Толькі тады каталіцкая царква пайшла на больш глыбокае рэфармаванне.

Трыдэнцкі сабор

*Трыдэнцкі сабор* (1545–1563 гг.) зрабіўся найважнейшым этапам Контррэфармацыі. На ім былі прынятыя пастановы, якія ўсталёўвалі строгі кодэкс

дысцыпліны для святароў, рэгламентавалі адукацыю, а таксама падкрэслівалі важнасць веры і добрых спраў для ўратавання душы. Пратэстанцкія багасловы, запрошаныя на Сабор, адмовіліся ўдзельнічаць у дэбатах.

Асноўным кірункам Контррэфармацыі было стварэнне і пашырэнне новых ордэнаў, такіх як ордэн езуітаў, створаны Ігнаціем Лаёлай, які ў папскай буле быў названы «баявым атрадам ваяўнічай царквы». Езуіты былі высокаадукаванымі людзьмі і актыўна займаліся місіянерскай дзейнасцю, пашыраючы каталіцызм на адкрытых землях.

**«Баявы атрад ваяўнічай царквы»**

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Езуіты былі вядомыя сваім імкненнем да ўсебаковай адукацыі. Яны стварылі сетку школ і ўніверсітэтаў па ўсёй Еўропе, дзе вучылі як будучых членаў ордэна, так і свецкіх студэнтаў.

1. *Якія навучальныя ўстановы былі створаны ордэнам езуітаў на тэрыторыі ВКЛ?*
2. *Прадстаўнікі ордэна мелі пэўную задачу — «вярнуць аблудныя масы да агароджы царквы». На якія якасці езуітаў звяртае ўвагу аўтар карыкатуры? Дайце сваю назву прадстаўленай ілюстрацыі.*
3. *Якія метады выкарыстоўвалі езуіты для дасягнення сваіх мэт?*
4. *Якія вы ведаеце духоўна-рыцарскія ордэны каталіцкай царквы? Чым яны адрозніваліся ад ордэна езуітаў?*



*Езуіты. Карыкатура. XVII ст.*

Контррэфармацыя праходзіла з пераменным поспехам. Калі каталіцызм здолеў захаваць уплыў у Паўднёвай Еўропе і Польшчы, дык пратэстантызм умацаваў свае пазіцыі ў Паўночнай Еўропе і большай частцы Германіі. Разам з тым Контррэфармацыя аказала значны ўплыў на фарміраванне сучаснага аблічча каталіцкай царквы.

*Рэфармацыя змяніла духоўны, палітычны і сацыяльна-эканамічны характар еўрапейскага грамадства. Яе вынікам было з'яўленне нацыянальных цэркваў, умацаванне свецкай улады, стварэнне ўмоў для развіцця нацыянальных дзяржаў. Пратэстантызм аказаўся больш, чым каталіцызм, прыстасаваны да ўмоў буржуазнага грамадства, якое фарміравалася.*

**калі ў свеце...**

1517 г. — пачатак Рэфармацыі ў Германіі

**на тэрыторыі Беларусі...**

1553 — у Брэсце заснаваная першая ў ВКЛ кальвінісцкая абшчына

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Што такое Рэфармацыя? Якія яе перадумовы і прычыны?
2. Хто ўзначаліў пратэстанцкі рух у Заходняй Еўропе ў XVI ст.? Назавіце асаблівасці Рэфармацыі ў Англіі, Германіі і Францыі.
3. Якім чынам каталіцкая царква змагалася з Рэфармацыяй? З апорай на картасхему (с. 166) і тэкст параграфа вызначце, у якіх краінах пратэстантызм атрымаў вялікае пашырэнне, а ў якіх пераважаў каталіцызм.
4. Складзіце схему або інтэлект-карту, якая сістэматызуе вынікі Рэфармацыі ў розных сферах грамадскага жыцця.